# У школьнай цяпліцы

У ПАЧАТКУ сакавіка, калі за вокнамі бушавала мяцеліца, у цяпліцы школы-інтэрната ўжо збіралі першы ўраджай. У школьную сталовую перадалі больш 5 кілаграмаў радыскі і каля 20 кілаграмаў зялёнай цыбулі.

Пабудаваная летась цяпліца ў школе заняла дастойнае месца ў вытворчым навучанні дзяцей. Цяпліца пераведзена на самаабслугоўванне рабят. Яны самі апальваюць яе, праводзяць пасяўныя і пасадачныя работы, даглядаюць расліны, вядуць назіранні. Кіруе ўсімі работамі ў цяпліцы вучаніца 10-га класа Галіна Вазміцель. Практыку праходзяць тут усе навучэнцы 5 — 10 класаў. Нядаўна вучні высадзілі з кубкаў у парнікі расаду ранняй капусты.

Школьныя гароднікі пад кіраўніцтвам настаўнікаў-біёлагаў імкнуцца поўнасцю выкарыстаць карысную плошчу цяпліцы. Пасяўныя работы пачалі ў канцы студзеня. Тады рабяты пасеялі радыску, пасадзілі цыбулю, высадзілі расаду ранняй капусты. А ўжо цяпер, пасля збору першага ўраджаю, уся плошча цяпліцы занята ранпімі агуркамі, памідорамі. На паліцах у скрынях вырошчваюцца кветкі. Ужо з'явіліся добрыя ўсходы шалфею, лабеліі і іншых.

НА ЗДЫМКУ: навучэнцы ў цяпліцы за доглядам раслін.

Фота В. Заўражнага.

